БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 31 мая 2001 года, чацвер, № 10 (1839)

ВІНШУЕМ!

# З наваселлем, дарагія ліцэісты!





Нарэшце спраўдзілася мара ліцэістаў і іх выкладчыкаў. 29 мая адбылася цырымонія святочнага адкрыцця новага будынка ліцэя БДУ. Ім стаў пасля кардынальнай рэканструкцыі былы Дом настаўніка. Цяпер гэта камфартабельны, сучасны будынак са светлымі, добра абсталяванымі аўдыторыямі, вялікай спортзалай, цудоўнай канцэртнай залай, чароўным пакоем для бальных танцаў і ўрачыстацей, дзівоснымі холамі і вестыбюлямі. Такі падарунак таленавітым юнакам і дзяўчатам стаў магчымым дзякуючы намаганням кіраўніцтва Белдзяржуніверсітэта, усіх зацікаўленых ведамстваў і падтрымцы Прэзідэнта Беларусі. Дарэчы, Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка прыехаў на цырымонію, каб асабіста павіншаваць ліцэістаў. Прэзідэнт адзначыў, што таленавітая моладзь — гэта фонд нацыі, гонар народа і прэстыж краіны. Таму адкрыццё новага будынка ліцэя — падзея важная для ўсёй нашай рэспублікі.

За больш чым дзесяцігадовае існаванне прэстыжны атэстат ліцэя БДУ атрымалі каля дзвюх тысяч выпускнікоў, сярод якіх кожны чацвёрты быў пераможцам школьных алімпіяд і турніраў. Штогод 99 працэнтаў навучэнцаў гэтай установы паступаюць у ВНУ нашай рэспублікі.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

*Фотаздымкі Аляксандра ЗАПОЛЬСКАГА*

# Лепшыя пакоі інтэрнатаў БДУ

У студэнцкім гарадку падведзеныя вынікі конкурсу "Лепшы пакой інтэрната БДУ". Цяжка было вызначыць адзін найлепшы на ўвесь студгарадок пакой, як гэта было ў мінулым годзе: умовы пражывання ў розных інтэрнатах у значнай ступені адрозніваюцца. Таму на гэты раз было вырашана вызначыць лепшы пакой у кожным інтэрнаце паасобку. Жыхары лепшага пакоя павінны былі на працягу года выконваць правілы пражывання, сачыць за ўтульнасцю і чысцінёй і атрымліваць адпаведныя адзнакі рэйдаў па праверцы стану пакояў, удзельнічаць у жыцці інтэрната.

Такім чынам, лепшымі прызнаныя:

у інтэрнаце № 3 — пакой 707а;
у інтэрнаце № 4 — пакой 406;
у інтэрнаце № 6 — пакой 412;
у інтэрнаце № 7 — пакой 1308а;
у інтэрнаце № 9 — пакой 15;
у інтэрнаце № 10 — пакой Г61б.

Інтэрнаты №№ 1 і 2 сёлета не ўдзельнічалі ў конкурсе, бо першы з іх зусім нядаўна ўвайшоў у эксплуатацыю пасля капітальнага рамонту, а другі — толькі рыхтуецца да рамонту.

## ФОТАПОЗІРК



Фота IREX/PROMEDIA

*Выканаць лабараторную работу — гэта толькі палова справы. Паспрабуй яшчэ яе і абараніць: тут трэба звярнуцца да падручнікаў і канспектаў*

# Баль для выпускнікоў

Як звычайна, канец мая — час апошняга званка для школьнікаў. 25 мая студэнцкі гарадок нашага універсітэта з дапамогай Апякунскага савета студгарадка ладзіў баль для сёлетніх выпускнікоў БДУ. Студэнтаў-пяцікурснікаў віншавалі дырэкцыя студгарадка і лепшыя творчыя калектывы. Самыя цікавыя нумары года ў выкананні танцавальнага калектыву Non-Stop, клуба шэйпінгу, музычных гуртоў, камандаў КВЗ, сюрпрызы ад сацыяльных педагогаў і педагогаў-арганізатараў — гэта далёка не поўны спіс таго, што адбывалася ў той вечар у студгарадку.

А потым былі танцы да самай раніцы...

# Куды падацца летам

### Крым

Каля тысячы студэнтаў накіроўваюцца гэтым летам ў лагеры працы і адпачынку на паўднёвае ўзбярэжжа Крыма. Яны будуць дапамагаць мясцовым саўгасам у падрэзцы і ўборцы вінаграду, абрыкосаў і іншай садавіны і гародніны. Саўгасы абяцаюць, што праца гэтая па сілах студэнтам і зойме ўсяго чатыры гадзіны ў дзень.

Увесь астатні час студэнты будуць... Зрэшты, чым сябе заняць (а тым больш — летам ды яшчэ і ў Крыме) — студэнт заўсёды знойдзе.

### Мінск

У межах праграмы другаснай занятасці моладзі на базе студэнцкага гарадка фарміруюцца працоўныя атрады па падрыхтоўцы інтэрнатаў да новага навучальнага года. Студэнты будуць займацца касметычным рамонтам, камплектацыяй пакояў з улікам запланаванага перазасялення. Праца будзе аплочвацца з фонду Мінскага гарадскога цэнтра занятасці насельніцтва.

Жадаючыя далучыцца да "раматрадаў" могуць атрымаць дадатковую інфармацыю па тэлефоне 227-55-26.

# Інтэрнат № 4 — самы спартыўны

У студэнцкім гарадку нашага універсітэта скончылася штогадовая Спартакіяда.

Спартакіяда традыцыйна праходзіць у два этапы. На пачатку першага навучальнага семестра ў інтэрнатах БДУ праводзяцца спаборніцтвы па розных відах спорту. Сёлета ў рамках Спартакіяды былі прадстаўленыя настольны тэніс, шахматны турнір, міні-футбол, гіравы спорт, перацягванне каната, баскетбол, плаванне, спартыўнае арыентаванне і більярд. З пераможцаў першынстваў інтэрнатаў фармуюцца каманды, якія прадстаўляюць інтэрнаты на другім этапе спаборніцтваў.

На гэты раз на Спартакіядзе вызначыліся наступныя пераможцы:

міні-футбол — інтэрнат № 4;
настольны тэніс — інтэрнат № 7;
гіравы спорт — інтэрнат № 4;
перацягванне каната — інтэрнат № 4;
баскетбол — інтэрнат № 7;
шахматы — інтэрнат № 6;
плаванне — інтэрнат № 7;
спартыўнае арыентаванне — інтэрнат № 10;
більярд — інтэрнат № 6.

Камандай-пераможцай па выніках усёй Спартакіяды студгарадка стала каманда інтэрната № 4.

Закрыццё Спартакіяды прайшло як і належыць — урачыста, прыгожа, з уручэннем кубкаў і граматаў пераможцам, з канцэртна-танцавальнай праграмай. Словам, так, як гэта прынята ў студэнтаў.

Дырэкцыя студгарадка ўдзячная за дапамогу ў правядзенні Спартакіяды рэктарату БДУ, асабіста рэктару А.У. Казуліну і прарэктару па вучэбнай рабоце У.Б. Аджаеву, Апякунскаму савету студгарадка, кафедры фізвыхавання БДУ і асабіста С.У. Макарэвічу, старшыні спортклуба БДУ В.І. Пятроўскаму, УП "Унідрагмет БДУ" і яго генеральнаму дырэктару Г.М. Корзуну, навукова-метадычнай установе БДУ "Рэспубліканскі цэнтр праблем чалавека" і яго дырэктару Дз.І. Сагайдаку, трэнерам, суддзям, інструктарам па фізкультуры, спартыўным камісіям студсаветаў інтэрнатаў і метадысту па спартыўна-аздараўленчай дзейнасці Т.В. Грынкевіч.

*Інфармацыйная служба студэнцкага гарадка БДУ*

АДКРЫЦЦІ

# СТВОРАНЫ АРЫГІНАЛЬНЫ ЛЕКАВЫ ПРЭПАРАТ

У лабараторыі хіміі свабоднарадыкальных працэсаў, якая адносіцца да НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ, упершыню шляхам хімічнага сінтэзу стварылі арыгінальны лекавы прэпарат, рабочая назва якога бутаменафен. Гэта добры антыгерпесны сродак. Валодае ён і раназажыўляльнымі, кроваспыняльнымі ўласцівасцямі.

Лабараторыя займаецца вывучэннем заканамернасцей свабодна-радыкальных працэсаў, якія адыгрываюць важную ролю пры пашкоджанні біялагічных сістэм.

Вялікая колькасць захворванняў якраз і звязана з актывацыяй гэтых рэакцый пад уздзеяннем унутраных і знешніх фактараў, такіх як сонечная або іянізуючая радыяцыя і інш. У лабараторыі распрацоўваюць эфектыўныя сінтэтычныя сродкі, здольныя тармазіць свабодна-радыкальныя працэсы або кіраваць імі. Такога кшталту рэчывы валодаюць мембранна-пратэктарнымі здольнасцямі.

Бутаменафен таксама дзейнічае эфектыўна дзякуючы таму, што можа стабілізаваць і ўзмацняць клетачныя мембраны.

Новы прэпарат толькі што прайшоў клінічныя выпрабаванні і зараз рэгіструецца ў фармакалагічным камітэце.

Калі справы пойдуць як мае быць, мы хутка ўбачым у аптэках яго мазевую форму. Дарэчы, субстанцыю для яго далейшай вытворчасці будуць атрымоўваць ва універсітэце, усё ў той жа самай лабараторыі.

Астатнія прэпараты, над якімі працуюць у лабараторыі хіміі свабодна-радыкальных працэсаў, знаходзяцца пакуль што на стадыі даклінічных выпрабаванняў. На іх далейшы лёс Алег Іосіфавіч Шадыра, кіраўнік лабараторыі, таксама глядзіць з аптымізмам. Справа ў тым, што за праект "Распрацоўка метадаў стварэння новых лекавых прэпаратаў на аснове даных па свабодна-радыкальным пераўтварэнні біялагічна важных малекул" яго лабараторыя атрымала грант ад Міжнароднага навукова-тэхнічнага цэнтра. Ужо куплены тры храматографы, іншае абсталяванне, а таксама патрэбныя рэактывы, якія павінны дапамагчы праводзіць выпрабаванні.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

ФОТАПОЗІРК



*Фота IREX/PROMEDIA*

*Важны этап у расшыфроўцы электронаграмы — вымярэнне становішча ліній. Студэнт 4-га курса хімфака Аляксандр Бандарэнка за гэтай працэдурай у лабараторыі электроннай мікраскапіі*

ЮБІЛЕІ

# КАФЕДРЫ ЯДЗЕРНАЙ ФІЗІКІ — 40!

*Сёлетні год юбілейны не толькі для універсітэта ў цэлым. Многія з падраздзяленняў БДУ таксама адзначаюць круглыя даты. Вось ужо 40 гадоў на фізічным факультэце існуе кафедра ядзернай фізікі. З нагоды гэтага юбілею карэспандэнт "Беларускага універсітэта" сустрэлася з загадчыкам кафедры, прафесарам, доктарам тэхнічных навук В.Я. ЯМНЫМ:*

***— Віталь Яўгенавіч, што адчувае калектыў супрацоўнікаў кафедры, якой "стукнула" 40 гадоў?***

— Вядома ж, настальгічныя ўспаміны. 18 мая было ўрачыстае пасяджэнне кафедры, прысвечанае гэтай даце. Панаваў вясёлы, радасны настрой: людзі вярталіся ў маладосць, на 20-25 гадоў назад, бо пасля распаду СССР калектыў кафедры амаль не змяніўся. Апынуцца ў такой сяброўскай утульнай атмасферы вельмі прыемна. Усе памаладзелі проста на вачах. Свята атрымалася на славу.

***— Пасля аварыі на ЧАЭС многія кажуць, што займацца ядзернай фізікай небяспечна...***

— Так, але і ад аўтамабіляў штогод гінуць сотні тысяч людзей. Тым не менш, іх не забараняюць як сродак перамяшчэння.

***— Чым, на вашую думку, з'яўляецца кафедра ядзернай фізікі для фізфака?***

— Нашая кафедра, як казалі выступоўцы 18 мая, аснова вялікай масавай навукі на фізфаку. Так, у 1975-77 гадах на нашай кафедры працавала 250 чалавек. Частка супрацоўнікаў аддзялілася. У.Р. Барышэўскі — дырэктар НДІ ядзерных праблем, міжнародны Сахараўскі універсітэт узначальвае супрацоўнік нашай кафедры А.М. Люцко.

За 40-гадовы "стаж" наша кафедра выпусціла больш за 100 кандыдатаў навук, каля 10 дактароў навук, ёсць члены-карэспандэнты Акадэміі навук, акадэмікі. Вось толькі некаторыя нашыя вядомыя супрацоўнікі: акадэмік НАН Беларусі М.А. Ельяшэвіч, удзельнік будаўніцтва першай у свеце атамнай электрастанцыі А.К. Красін, прафесар І.З. Фішэр, акадэмік НАН Беларусі А.А. Міхалевіч, акадэмік НАН Беларусі А.Ф. Чарняўскі, член-карэспандэнт НАН Беларусі С.С. Шушкевіч, віцэ-прэм'ер урада Беларусі М.І. Дзямчук. Стварыў кафедру Аляксандр Мікалаевіч Пісарэўскі, які прыехаў з Ленінграда.

***— Распавядзіце, калі ласка, пра асноўныя дасягненні кафедры.***

— Галоўнае дасягненне — выпуск спецыялістаў — прафесіяналаў сваёй справы. Так, Уладзімір Рыгоравіч Барышэўскі — аўтар адкрыццяў у галіне ядзернай оптыкі. Сотні вынаходніцтваў, укаранёных у прамысловасць, народную гаспадарку, тысячы публікацыяў, артыкулаў, кніг, манаграфіяў — усё гэта заслугі нашых супрацоўнікаў.

***— А якія галоўныя накірункі вашай працы?***

— Мы пастаянна ўдасканальваем навучальны працэс, вядзём метадычную работу. Раней у нас было шмат заказаў для вайскоўцаў. Цяпер мы робім прылады, якія дазваляюць з высокай дакладнасцю вымяраць узровень радыяцыі ў найбольш пацярпелых раёнах, займаемся распрацоўкай прыладаў для вызначэння ачагоў лясных пажараў. А.Л. Халмецкі займаецца месбаўэрскай спектраскапіяй, тэарэтычнай ядзернай фізікай займаюцца прафесар В.В. Ціхаміраў і дацэнт І.Я. Дубоўская.

***— Мне застаецца толькі пажадаць вашай кафедры новых навуковых дасягненняў і, вядома, доўгіх гадоў!***

*Алена КУРХІНЕН*

# Бібліятэчныя таямніцы

*Кнігі чытаюць усе – ад малых да старых. Свет без кніг нельга ўявіць. Кніга спадарожнічае чалавеку на працягу ўсяго яго жыцця.*

*Бібліятэка Белдзяржуніверсітэта – адна з самых старых фундаментальных бібліятэк нашай краіны. Яе гісторыя будзе распаведзена ў кнізе Ірыны Уладзіміраўны Арахоўскай "Бібліятэчныя таямніцы", якая рыхтуецца да друку ў БДУ. Амаль 30 гадоў гэтая жанчына працавала дырэктарам бібліятэкі і ведае яе жыццё знутры.*

*Распавед пра бібліятэку – гэта частка гісторыі ўніверсітэта. Яна арганічна і шчыльна сплеценая з гісторыяй нашай ВНУ, яго шматграннай дзейнасцю. Аўтар кнігі – высокапрафесійна падрыхтаваны, удумлівы, ініцыятыўны чалавек. Яе працалюбства, наватарства, чулае і клапатлівае стаўленне да чытачоў і супрацоўнікаў бібліятэкі прынеслі ёй заслужаны аўтарытэт. Яна адзначана званнем Заслужанага работніка культуры, мае ўрадавыя ўзнагароды.*

*Яе праца, па сутнасці, першая значная кніга пра гісторыю бібліятэкі і яе шматлікі калектыў. Урыўкі з гэтай кнігі мы і прапануем сёння чытачам "Беларускага ўніверсітэта".*

## Першы рэктар БДУ

Ужо ў 1919 годзе падрыхтоўчая камісія па стварэнні ўніверсітэта распачала вялікую працу ў гарадах Беларусі па зборы кніг для бібліятэкі будучага БДУ.

Аднак акупацыя Беларусі белапалякамі не дазволіла ажыццявіць намечаныя планы. Адкрыццё ўніверсітэта стала магчымым толькі ў 1921 годзе.

10 ліпеня 1921 года рэктарам Белдзяржуніверсітэта быў прызначаны У.І. Пічэта.

Якім ён быў? Чаму яго так хвалявалі пытанні фармавання кніжнага фонду? На вядомай фатаграфіі ў яго строгі праніклівы погляд, і, калі б давялося, я б уваходзіла ў яго кабінет з трапятаннем і ўпэўненасцю, што ён вырашыць усе пытанні.

Як хацелася б паслухаць хоць адну з яго лекцый, хаця б у запісе. Але, на жаль!.. Тады іх не было магчымасці запісаць. Зараз ёсць такая магчымасць захаваць у запісе на відэа лекцыі значных і любімых студэнтамі выкладчыкаў. Мне заўжды хацелася, каб універсітэцкая бібліятэка мела фонд такіх запісаў. Гэта яшчэ раз дапамагала б студэнтам разабрацца і засвоіць матэрыял. А для гісторыі колькі можна было б захаваць цікавых лекцый з методыкай, уласцівай толькі гэтаму выкладчыку.

Уладзімір Іванавіч часта ездзіў за мяжу. Пра гэта таксама сведчаць дакументы. Ездзіў ён туды, галоўным чынам, для вывучэння літаратуры па гісторыі заходніх славянаў. Кожная яго паездка ўзбагачала Фундаментальную бібліятэку універсітэта. Ён прывозіў не толькі літаратуру, але і складаў спісы арганізацый, у якіх можна набыць літаратуру і якую канкрэтна літаратуру можна набыць. Гэтае пытанне яшчэ чакае свайго дапытлівага даследчыка.

У.І. Пічэта пастаянна адшукваў магчымасць у цяжкі для ўніверсітэта час аплочваць рахункі на літаратуру і абсталяванне для бібліятэкі. Дакументы першых гадоў працы бібліятэкі прасякнутыя яго клопатам аб развіцці маладой установы. Таму мы з вялікай удзячнасцю падкрэсліваем яшчэ адну не зусім раскрытую старонку ў біяграфіі буйнога навукоўца, таленавітага даследчыка, выдатнага арганізатара навукі, умелага педагога, выхавальніка моладзі — першага рэктара Белдзяржуніверсітэта.

Уладзімір Іванавіч прымаў непасрэдны ўдзел у фармаванні фонду бібліятэкі. Так, у 1924 годзе ён прывёз з Петраграда 400 кніг, якія атрымаў дзякуючы сваім клопатам. Рэктар дамогся згоды на перадачу ўніверсітэту цэлых камплектаў кніг, якіх да таго часу не было ў Беларусі. З паездкі ў Польшчу Пічэта прывёз шмат кніг па беларусазнаўстве і вывучэнні польскага краю. Асабліва важна, што сярод прывезеных кніг былі старадрукі, якія выдаваліся Кракаўскай акадэміяй навук і іншымі навуковымі асяродкамі. З Львова Уладзімір Іванавіч прывёз кнігі на ўкраінскай мове, выдадзеныя Львоўскім навуковым выдавецтвам. У Кіеў і Харкаў Пічэта ездзіў, каб атрымаць былую бібліятэку графа Храптовіча. Перад намі дакладная запіска ў ЦВК БССР пра неабходнасць камплектавання Беларускай дзяржаўнай і ўніверсітэцкай бібліятэкі старадаўнімі беларускімі выданнямі. З гэтага дакумента перыяду лютага 1925 года хочацца прывесці вытрымку:

«Спаўняецца ў сакавіку 1925 г. 400-годдзе беларускага друку — выхаду ў Вільні "Апостала" Ф. Скарыны. Гэта павінна, безумоўна, быць адзначана як буйнейшае гістарычнае свята беларускай культуры. У гэтым святкаванні Беларуская Дзяржаўная і ўніверсітэцкая бібліятэка павінна заняць тое цэнтральнае месца, якое належыць ёй па праве як дзяржаўнаму кнігасховішчу БССР».

Дыяпазон навуковых інтарэсаў выдатнага гісторыка быў шырокім. Заўважнае месца сярод іх займала гісторыя беларускага народа. Некаторыя вынікі яго шматгадовых даследаванняў былі надрукаваны ў кнізе «Беларусь і Літва XVI-XVII стагоддзяў». Шэраг яго прац прысвячаецца гістарычным сувязям беларускага і польскага народаў. Пра Уладзіміра Іванавіча Пічэту напісана шмат, але не дастаткова, каб усебакова раскрыць яго грамадскае значэнне як нацыянальнага асветніка і грамадзяніна. Толькі таленавіты, надзелены дарам далёкага прадбачання чалавек мог рэалізаваць мару беларускага народа пра нацыянальны універсітэт. Рэктар ствараў універсітэт на еўрапейскі лад з улікам палітычнай і эканамічнай спецыфікі рэспублікі.

## Загадчыкі і дырэктары бібліятэкі

Першай загадчыцай універсітэцкай бібліятэкі была Яўгенія Адольфаўна Гурвіч. На гэтую пасаду яна была прызначана універсітэцкай бібліятэчнай камісіяй.

Заўсёды вельмі цікава даведацца, хто ж стаяў ля вытокаў універсітэцкай бібліятэкі, асабліва ў такі цяжкі час. З асабістай карткі работніка Наркамасветы становіцца вядома, што Гурвіч Яўгенія Адольфаўна пражывала па адрасе вул. Юр'еўская, д. 8, кв. 3. Нарадзілася яна ў 1861 годзе ў Вільні, размаўляла на яўрэйскай, польскай, французскай, нямецкай і англійскай мовах. Адукацыя — вышэйшая. Мела спецыяльнасць настаўніцы і бібліятэкара. Навучальная спецыяльнасць, галіна, прадмет выкладання ў лістку ўказваюцца так: геаграфія, прыродазнаўства.

Сціслыя радкі асабовай справы змясцілі ў сябе ранейшыя заняткі:

а) да Кастрычніцкага перавароту — педагагічная дзейнасць, праца ў бібліятэцы;

б) пры Савецкай уладзе — загадчыца пазашкольнага аддзела камасветы;

в) пры польскай акупацыі — педагагічная дзейнасць, праца ў бібліятэцы.

Яна была членам саюза работнікаў асветы, членам палітычнай партыі Бунд з часу яе ўзнікнення (нумар партыйнага білета — 15).

Пратакол № 13 пасяджэння СНК БССР ад 23 мая 1921 года за подпісам Чарвякова зафіксаваў рашэнне пра першы штатны расклад бібліятэкі:

1. Загадчык бібліятэкі;

2. 4 памочнікі на правах бібліятэкараў;

3. 5 рэгістратараў на правах канторшчыкаў;

4. 3 агенты па закупцы.

Канечне, 13 чалавек пры такім шквальным паступленні літаратуры, якую трэба было ўводзіць у дзейны фонд, вельмі мала. Таму практычна з першых дзён існавання бібліятэкі бібліятэкарам стала дапамагаць студэнцкая камісія, утвораная ва універсітэце. Бібліятэка набірала і часовых работнікаў, якія пераважна таксама былі студэнтамі.

Калі знаёмішся з дакументамі тых часоў, адчуваеш напружанасць, у якой працаваў калектыў. Калі б прааналізаваць усю тую працу па нормах сучаснага дня, то рэктарат здзівіўся б таму, як у такі сціслы тэрмін бібліятэка змагла адчыніць свае дзверы першым студэнтам універсітэта. Дарэчы, паводле адных дакументаў, бібліятэка павінна была адкрыцца для агульнага карыстання 30 чэрвеня 1921 года, паводле іншых — дата адкрыцця адносіцца да 1 кастрычніка, узгадваецца і дата 15 верасня.

У даце 30 чэрвеня можна сумнявацца, бо хутчэй за ўсё гэта была бібліятэка рабфака. Агульная ж бібліятэка была адкрыта для чытачоў 1 кастрычніка 1921 года. Гэтая дата можа лічыцца праўдзівай яшчэ і таму, што пра яе кажа Б.І. Сіманоўскі, які працаваў у той час у бібліятэцы універсітэта. З дакументаў таго перыяду становіцца таксама зразумела, што чытальня для чытачоў была адчыненая пасля Новага года, г.зн. ужо ў 1922 годзе, калі для яе было атрымана абсталяванне.

У дакументах таго часу пісалі, што «...работа по организации и постановке библиотеки БГУ ведется, начиная с июня 1921 г. и к концу апреля 1922 г. ее первоначальная стадия, охватывающая оборудование библиотеки, комплектования книжного состава, его оформления, инвентаризация и элементарное описание может считаться законченным».

У аснове кніжнага фонду бібліятэкі было прыкладна 40 тысяч тамоў, якія сабраў Наркамасветы і перадаў універсітэту. Асноўнай цяжкасцю ў гэты перыяд была адсутнасць каталожных шафаў. Гэта значна тармазіла арганізацыю каталогаў для бібліятэкі.

# Б.І. Сіманоўскі

Лёс гэтага чалавека адлюстроўвае ўвесь яго нялёгкі час. Беніцыян Іосіфавіч Сіманоўскі зазнаў нямала цяжкасцяў, але трываласць духу і інтарэс да жыцця захаваў да самага канца.

Ён быў прызначаны памочнікам Яўгеніі Адольфаўны Гурвіч у 1921 годзе. І першая згадка пра яго ва універсітэцкай бібліятэцы датычыцца 5 ліпеня 1921 года, калі ён зрабіў даклад аб працы ў бібліятэцы, чым адразу ж звярнуў на сябе ўвагу праўлення універсітэта. 3 лістапада 1921 года ўжо на пасадзе загадчыка універсітэцкай бібліятэкі ён рабіў даклад аб працы бібліятэкі прафесарска-выкладчыцкаму саставу. Першы крок на новай пасадзе — упарадкаванне карыстання кнігамі: ён прапанаваў выдаваць чытачам на рукі не больш за 3 кнігі тэрмінам не даўжэй за 3 тыдні.

Хто ж ён такі, Б.І. Сіманоўскі? Як трапіў на бібліятэчную ніву?

Нарадзіўся наш герой у Бабруйску (Мінская губерня) у сям'і саматужніка-смалакура. Скончыў сярэднюю школу ў Вільні, за мяжой атрымаў вышэйшую літаратурную адукацыю. Спярша навучаўся ў парыжскай Сарбоне, а потым у Швейцарыі ў Бернскім універсітэце скончыў літаратурнае аддзяленне.

У 1914 годзе, скончыўшы адукацыю за мяжой, ён вярнуўся ў родны горад і да 1917 года вывучаў літаратуру і займаўся перакладамі (пераважна вершаў Эміля Верхарна). Пасля Лютаўскай рэвалюцыі пераехаў у Маскву, дзе ўладкаваўся на працу ў рэдакцыю энцыклапедыі братоў Гранат. Але жнівень 1917 года зноў сустрэў у родным Бабруйску, працаваў у тамтэйшым Савеце, з'яўляючыся членам рэдакцыі газеты "Известия", сакратаром біржы працы. З ліпеня 1918 года Сіманоўскі пачаў працаваць загадчыкам бабруйскай гарадской бібліятэкі. Ён меркаваў арганізаваць у бібліятэцы аддзел беларускай літаратуры, якая раскрывае мінуўшчыну і цяперашні час беларускага народа. У яго было шмат праектаў, задумак і прапаноў, але супрацоўнікам бібліятэкі яны здаваліся абсурднымі.

Надалей бібліятэчная дзейнасць станецца неад'емнай часткай яго біяграфіі. Залічаны з ліпеня 1921 года ва універсітэцкую бібліятэку, ён з характэрнай энергіяй уключаецца ў жыццё універсітэта.

Паслужны спіс адзначае такія пасады: бібліятэкар, загадчык бібліятэкі, потым чамусьці галоўны бібліятэкар, потым зноў загадчык бібліятэкі. У кастрычніку 1922 года на старонках газеты "Савецкая Беларусь" быў надрукаваны план Сіманоўскага па арганізацыі дзяржаўнай і універсітэцкай бібліятэкі. Меркавалася, што новая бібліятэка будзе цэнтральным краявым кнігасховішчам, якое адначасова будзе выконваць функцыі фундаментальнай акадэмічнай бібліятэкі пры галоўнай вышэйшай школе Беларусі. Адначасова яна мусіць быць і дзяржаўнай бібліятэкай. Апроч гэтага існаваў і іншы праект, паводле яго трэба было стварыць тры бібліятэкі: цэнтральную беларускую (па беларусазнаўстве), цэнтральную бібліятэку бібліятэчнай сеткі (на гэтую ролю прэтэндавала цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.С. Пушкіна), фундаментальную універсітэцкую бібліятэку. Пры энергічнай падтрымцы рэктара БДУ У.І. Пічэты быў падтрыманы праект Сіманоўскага. Гэты праект пачаў ажыццяўляцца Наркамасветы БССР з канца 1921 года. Адкрыццё аб'яднанай Дзяржаўнай і універсітэцкай бібліятэкі адбылося 1 мая 1922 года.

Прадметам асаблівага клопату Сіманоўскага ва універсітэцкай бібліятэцы было камплектаванне фондаў. Ён імкнуўся збіраць у бібліятэку рэдкія дарэвалюцыйныя выданні і тую літаратуру, якая толькі што выдавалася. Ацяплення не было, працаваць даводзілася ў паліто і валёнках. Цяжка было набыць замкі, і нават вяроўкі для перавозкі кніг даводзілася доўга шукаць на рынку. Дровы для печкі здабываліся ўсімі легальнымі і нелегальнымі спосабамі. І ўсё ж бібліятэка працавала паспяхова, пра што паведамляюць газеты таго часу.

Неаднакроць Сіманоўскага адзначалі на пасяджэннях праўлення універсітэта як добрага знаўцу літаратуры і чалавека, лёгкага на пад'ём для шматлікіх раз'ездаў па Беларусі і за яе межамі ў пошуках літаратуры. Ён заўжды быў у цэнтры падзеяў бібліятэчнага жыцця, прымаў актыўны ўдзел у працы бібліятэчна-біяграфічных з'ездаў і нарадаў.

Па ініцыятыве Б.І. Сіманоўскага быў створаны бібліятэчны факультэт пры Мінскім педагагічным інстытуце, дзе ён загадваў кафедрай бібліятэказнаўства і шмат гадоў выкладаў бібліятэказнаўчыя дысцыпліны.

Я не ставіла перад сабой мэту поўнасцю паказаць біяграфію Сіманоўскага: яна шматгранная і цікавая, пра яго выдадзена нямала матэрыялаў. Мне хацелася выявіць, чым ён займаўся ва універсітэцкай і дзяржаўнай бібліятэцы, дзе яго жыццёвыя шляхі перасякаліся з універсітэтам. Так, у чэрвені 1941 года ён быў у эвакуацыі ў Сталінградзе, а ў лістападзе 1941 года пераехаў у Саратаў, дзе працаваў навуковым супрацоўнікам Саратаўскага дзяржаўнага універсітэта, з якім БДУ заўсёды трымаў шчыльную повязь.

Заслужаны дзеяч культуры БССР Б.І. Сіманоўскі, стаўшы дырэктарам Дзяржаўнай бібліятэкі, не губляў сувязяў з Белдзяржуніверсітэтам і універсітэцкай бібліятэкай. Пры яго дапамозе кафедра гісторыі БССР склала першы том краязнаўчай бібліяграфіі "Гісторыя БССР. Тэматычны паказальнік савецкай літаратуры. 1945-1958 гг." Пра выданне гэтай працы паклапацілася Разалія Герасімаўна Любіна, пасляваенны дырэктар бібліятэкі. Іх аб'ядноўвала цікавасць да бібліятэчных справаў, яны сябравалі і абменьваліся сваімі поспехамі і няўдачамі. Гэта была ўжо не толькі прафесійная повязь пакаленняў, але і інтарэс да жыцця іншых буйных бібліятэк.

У Сіманоўскім адчувалася сталасць розуму, нястрымная актыўнасць думкі, імкненне дзейнічаць, шырыня і цэласнасць светагляду. Ён амаль ніколі не выступаў па напісаным тэксце, а на трыбуну выходзіў толькі з нейкімі "пісулькамі", зразумелымі яму аднаму. Але Б.І. Сіманоўскі заўсёды і на ўсё меў свой пункт гледжання, быў упрыгожаннем усіх сустрэчаў — на любым узроўні.

# ПЕРШЫ ЛЕКТАР

Першая лекцыя для студэнтаў Белдзяржуніверсітэта прагучала 31 кастрычніка 1921 года — "Аб культуры Міжземнамор'я ў эпоху панавання Рыма". Прачытаў яе прафесар Дзмітрый Пятровіч Канчалоўскі. Кім жа быў гэты чалавек — першы лектар БДУ? Дакументы пра яго захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь.

Нарадзіўся Дзмітрый Пятровіч 15 сакавіка 1873 года ў сяле Светавы Лучы Купянскага павета Харкаўскай губерні. Скончыў у 1903 годзе гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта, пасля чаго быў пакінуты знакамітым расійскім гісторыкам-антыказнаўцам прафесарам Р.Ю. Вiперам пры кафедры агульнай гісторыі. У 1904-1906 гадах у якасці студэнта Берлінскага універсітэта слухаў лекцыі па рымскай гісторыі, гісторыі Грэцыі, сацыялогіі, этналогіі, эпіграфіцы, гісторыі хрысціянства. А чыталі гэтыя курсы такія аўтарытэтныя ў Еўропе вучоныя, як Б. Мегер, Г. Зімель, О. Хіршфелель і інш.

Вярнуўшыся ў Маскву ўвосень 1906 года, Канчалоўскі быў запрошаны на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта весці практычныя заняткі са студэнтамі малодшых курсаў па агульнай гісторыі, а ўвосень 1907 года пачаў выкладанне рымскай гісторыі на Маскоўскіх вышэйшых жаночых курсах. Увесну 1911 года Дз.П. Канчалоўскі здаў магістэрскія іспыты па агульнай гісторыі ў Маскоўскім універсітэце і тады ж вымушаны быў пакінуць выкладанне ва універсітэце ў сувязі з адстаўкай рэктара Мануілава і групы прафесараў. Гэты дэмарш групы вядомых вучоных МДУ, да якога далучыўся і Дз.П. Канчалоўскі, меў палітычную афарбоўку. Аднак ад выкладання сваёй улюбёнай гісторыі Дзмітрый Пятровіч не адмовіўся: на вышэйшых жаночых курсах ён працягваў выкладаць да лістапада 1919 года. Потым з-за аб'яднання ВНУ Масквы ён быў пераведзены на пасаду прафесара агульнай гісторыі так званага Першага МДУ.

Дзмітрый Пятровіч быў чалавекам шырокай эрудыцыі: з замежных моваў ён валодаў нямецкай, французскай, англійскай і італьянскай. Да пачатку працы ў Белдзяржуніверсітэце ён паспеў выдаць некалькі навуковых працаў па агульнай гісторыі як уласных, так і перакладных (з сваімі навуковымі прадмовамі і каментарыямі).

У 1921 годзе Дз.П. Канчалоўскі лічыцца ўжо прафесарам БДУ, а з ліпеня таго ж года ён знаходзіўся яшчэ і на дадатковай пасадзе прафесара Смаленскага інстытута народнай адукацыі. Прафесарам на кафедры агульнай гісторыі факультэта грамадскіх навук БДУ Дзмітрый Пятровіч працаваў з 9 верасня 1921 года па 1 верасня 1923 года.

Калі ўважліва прааналізаваць невялічкую "асабістую справу" прафесара, у якой усяго некалькі старонак тэксту, то можна зрабіць выснову, што Дз.П. Канчалоўскі быў персанальна запрошаны ў БДУ рэктарам У.І. Пічэтам. Напэўна, паміж імі існавалі сяброўскія адносіны яшчэ з часоў сумеснай працы ў МДУ. Гэтае меркаванне пацвярджае і тое, што ў 1911 годзе У.І. Пічэта, "належачы да раду левай прафесуры" (аб гэтым ён сам напісаў у сваёй аўтабіяграфіі), разам з Дз.П. Канчалоўскім пакінуў МДУ, і тое, што рэктар не цураўся асабіста адвезці жалаванне Дзмітрыя Пятровіча ў Маскву, калі той не змог сам прыехаць за ім у Мінск. Цікава, што ў чэрвені 1922 года У.І. Пічэта адвёз і грошы (аж 30 мільёнаў тагачасных рублёў), якія выдзеліў БДУ Дзмітрыю Пятровічу, каб той змог купіць білет на цягнік, прыехаць да студэнтаў БДУ і прыняць у іх залік. Такія пераезды былі звязаны і са шматлікімі бюракратычнымі праналочкамі, цяжкасцямі, абумоўленымі нядаўнімі рэвалюцыйнымі і ваеннымі падзеямі. Напрыклад, каб прыехаць у Мінск з Масквы патрэбны быў спецыяльны пропуск, дзеля чаго праўленне БДУ прадстаўляла працоўную кніжку прафесара ў Цэнтральны аддзел прапускоў для атрымання дазволу і неабходнай паперкі.

І яшчэ адна заўвага. На жаль, жыццёвы шлях першага лектара БДУ вельмі цяжка прасачыць, бо інфармацыі пра гэтага гісторыка ў адпаведных выданнях і архівах не вельмі шмат. Так, нельга пакуль дакладна гаварыць аб тым, які ўзровень навуковай кваліфікацыі меў Дз.П. Канчалоўскі на час яго запрашэння ў БДУ. Калі мець на ўвазе пералік яго прац, якія ён сваёй рукой упісаў у аўтабіяграфію, то яны не дастаткова ўнушальныя як па колькасці, так і па навуковых характарыстыках. Найбольш грунтоўным у навуковым сэнсе здаецца даследаванне "Аграрное движение в Риме и реформы братьев Гракхов", якое гісторык падрыхтаваў да друку якраз у час сваёй працы ў БДУ. Верагодна, пасада прафесара БДУ, на якую быў уладкаваны Дзмітрый Пятровіч, не была падмацавана адпаведнага ўзроўню навуковай дысертацыяй. Але такое становішча з кадрамі было тады звыклым і пасады прафесараў часцей займалі выкладчыкі без доктарскіх ступеняў, чым з імі. Недарэчным было і тое, што шмат універсітэцкіх выкладчыкаў вялі заняткі са студэнтамі літаральна "з колаў", бо прыязджалі ў БДУ з Масквы і іншых расійскіх гарадоў на некалькі дзён, каб пасля хуткай "вычыткі" навучальных курсаў зноў вярнуцца да сваіх сем'яў. Таму навучальны працэс у БДУ амаль на працягу ўсіх 20-30-х гадоў быў залежным ад выкладчыкаў, якія працавалі "наездамі", ад таго, якім часам і якімі магчымасцямі яны валодалі. Так працаваў у БДУ і Дз.П. Канчалоўскі: ён стала жыў у Маскве ў доме № 22 па Мёртвым (А.Я. — !) завулку. Дарэчы, сям'я рэктара У.І. Пічэты таксама знаходзілася ў Маскве, што вымушала (ці дазваляла?) яго часта наведвацца ў сталіцу СССР.

Так ці інакш, але менавіта Дзмітрый Пятровіч Канчалоўскі сваёй лектарскай працай як бы адчыніў дзверы першым студэнтам аднаўленага беларускага універсітэта ў свет ведаў, у XX стагоддзе. І тым самым ён назаўсёды ўвайшоў у гісторыю БДУ, больш за тое — у гісторыю беларускага асветніцтва, культуры.

*А.А. ЯНОЎСКІ,*
*кандыдат гістарычных навук,*
*прарэктар БДУ*
*па вучэбнай рабоце*

**ПАДПІСКА – 2001**

# "ВЕСНІК БДУ"

Працягваецца падпіска на перыядычныя выданні на другое паўгоддзе 2001 года.

"Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" — адзіны ў рэспубліцы навукова-тэарэтычны часопіс шырокага профілю, які асвятляе дасягненні беларускіх навукоўцаў у галіне фундаментальных, прыкладных, грамадскіх і гуманітарных навук.

"Веснік БДУ" паступае ў вышэйшыя навучальныя ўстановы і навуковыя цэнтры больш чым 30 краін блізкага і далёкага замежжа, уваходзіць у пералік выданняў, зацверджаных ВАК Беларусі пры абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

Падпісная цана на часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" па серыях наступная:

серыя І (індэкс 74851) — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 3, верасень):

індывідуальная — 1371 руб., ведамасная — 2642 руб.;

серыя II (індэкс 74852) — хімія, біялогія, геаграфія (№ 3, кастрычнік):

індывідуальная — 1371 руб., ведамасная — 2642 руб.;

серыя III (індэкс 74853) — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 2, ліпень, № 3, лістапад):

індывідуальная — 2741 руб., ведамасная — 5284 руб.;

серыя IV (індэкс 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 2, жнівень, № 3, снежань):

індывідуальная — 2741 руб., ведамасная — 5284 руб.

Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.

# АД ХАТЫНІ ДА БУДСЛАВА



Студэнты нашага універсітэта працягваюць знаёміцца з гістарычнымі помнікамі і славутымі мясцінамі сваёй радзімы. Днямі група супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ (актывісты, слухачы школы маладзёжнага актыву універсітэта) наведалі адзін з самых маляўнічых куткоў Беларусі — Камену, Даўгінава, Будслаў (праездам праз Лагойск, Хатынь, Плешчаніцы, Крайск, Крывічы). Вандроўка стала магчымай дзякуючы ўпраўленню выхаваўчай работы з моладдзю і студэнцкаму гарадку БДУ, якія пастараліся зрабіць экскурсію незабыўнай. Трэба адзначыць, ім гэта ўдалося.

Напрыклад, мала хто можа правільна адказаць на пытанне: хто спаліў Хатынь? Фашысты? Многія гады нас вучылі менавіта такому адказу... Але гісторыя гаворыць, што здзейсніў гэта атрад (які амаль поўнасцю складаўся з украінцаў) пад кіраўніцтвам Рыгора Васюры — ураджэнца Плешчаніцаў. Менавіта гэты атрад ператварыў Хатынь у попел. Вайна скончылася, але злачынца не быў пакараны. Толькі ў 1984 годзе Р. Васюру знайшлі ў Кіеве і сакрэтна прывезлі ў Мінск. Суд прызначыў яму вышэйшую меру пакарання.

Сёння ландышы абсыпалі лес ад Плешчаніцаў да Хатыні. Быццам слёзы, ператвораныя ў дробненькія беленькія кветачкі, зіхацелі яны пад промнямі сонца, нагадваючы пра тое, што ніхто не забыты...

У Даўгінаве мы наведалі касцёл святога Станіслава, пабудаваны ў стылі класіцызму ў 1853 годзе. Тут мы пабачылі 14 карцін, якія паказваюць шлях Ісуса Хрыста да Галгофы.

Наступным пунктам праграмы была вёска Будслаў, якая славіцца сваім санктуарыем Маці Божай Будслаўскай, пабудаваным у стылі барока (гл. фота). Назва вёскі — ад слова "будаваць": тут у 1504 годзе манахі вырашылі пабудаваць сабе жытло. У 1582 (?) годзе ім з'явілася Маці Божая і сказала пабудаваць на гэтым месцы храм, каб яднаць людзей з Богам. Так пачалося будаўніцтва драўлянай капліčкі, слава якой разышлася па ўсёй Беларусі і па-за яе межамі. З Вільні прывезлі сюды абраз Божай Маці, а ў 1643 годзе манахі паставілі ў касцёле алтар, які з'яўляецца вялікай каштоўнасцю. Спалучэнне пазалоты і чорнага колеру надае яму таямнічую прывабнасць.

Праз нейкі час Кліменцій VIII прывёз у падарунак касцёлу цудадзейны абраз Божай Маці, і вось ужо колькі гадоў ён з'яўляецца адным з самых вядомых у Беларусі.

Уражаная прыгажосцю даўгінаўскага касцёла, нашая група прыпынілася на беразе Вілейскага вадасховішча. Пад цёплымі промнямі майскага сонейка студэнты дзяліліся ўражаннямі, спрачаліся паміж сабой, дзякавалі арганізатарам за цікавую вандроўку. Пабольш бы такіх...

*Марына ДУБІНА,*
*студэнтка факультэта журналістыкі БДУ*

ФЕСТЫВАЛІ

# *Адкрыем сэрцы музыцы*

У Палацы культуры аўтазавода 15-17 мая праходзіў І фестываль харавога мастацтва сярод навучэнцаў, студэнтаў, педагагічных работнікаў, навучэнцаў ПТВ.

Вынікі гэтага свята спеваў падвёў рэжысёр канцэрта Валерый Пятровіч Шымчонак:

— Фестываль адбыўся дзякуючы міністэрству адукацыі Беларусі і Цэнтру мастацкай творчасці ПК "Юнацтва". Галоўнай мэтай было паказаць узровень харавога мастацтва ў навучальных установах Беларусі. Фестываль выдаўся яркім паводле рэпертуару, паказаў годны стан харавой культуры сярод моладзі. Асабліва варта вылучыць унікальны калектыў БДПА, які прадстаўляе змяшаны хор (жанчыны, хлопцы і дзяўчаты): яны выступілі на высокім узроўні. У гэтага хора вельмі таленавіты кіраўнік — Аляксандр Валер'евіч Мінінкоў. Адзначу і лаўрэатаў — Брэсцкі і Гомельскі педуніверсітэты.

Такія фестывалі будуць праводзіцца і ў далейшым. Галоўную задачу — узняць значнасць жанру — мы выканалі!

*Алена КУРХІНЕН*

# *Дзяўчаты былі ў захапленні...*

У клубе "Рэактар" 19 мая ўпершыню прайшоў фестываль усходніх адзінаборстваў, які дапамаглі арганізаваць міністэрства спорту і турызму Беларусі і Федэрацыя у-шу Рэспублікі Беларусь.

Яскравым незабыўным выступам парадавалі гледачоў хлопцы са школы ўсходніх мастацтваў "Тай Пін", якія біліся на мячах у незвычайных чорных касцюмах пад музыку Limp Bizkit, Rammstein, Offspring, Metallica і Cypress Hill, — усё выглядала містычна, проста займала дых!

Потым адбыліся паядынкі паміж хлопцамі з розных клубаў у роўных вагавых катэгорыях. Канечне, больш за ўсё ўразіў бой у вагавай катэгорыі 65 кг, калі сапернік выкінуў барца за межы рынга, але той ускочыў і працягваў бой, нібыта нічога не здарылася. Асабліва запомніліся прадстаўнікі клубаў традыцыйных кітайскіх мастацтваў і спартыўны клуб "Сінь-Цзяо".

Трэба адзначыць прафесійна аформленае асвятленне, якое падкрэслівала ўсё дзейства.

У перапынках паміж баямі выступалі хлопцы, якія дэманстравалі розныя прыёмы у-шу і медытацыі, а некаторыя нават уваходзілі ў транс ад таго, што адбывалася навокал.

Была прадстаўлена калекцыя старажытных кітайскіх і японскіх мячоў, якая проста зачароўвала вока.

Прысутныя ў зале дзяўчаты належным чынам ацанілі сілу і здольнасці хлопцаў: сапраўдны мужчына павінен умець абараніць сваю абранніцу.

*Алена КУРХІНЕН*

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# *Конны спорт у Ратамцы*

Штогадовыя спаборніцтвы па вышэйшай школе верхавой язды адбыліся 19 мая ў Ратамцы.

Па словах суддзі Сяргея Запрагаева, да апошняга моманту трымалася ў фаварытах наша беларуская спартсменка Святлана Еўшчык. Аднак у фінале ўсе тры прызавыя месцы занялі расіяне, якія выступілі вельмі якасна.

Спаборніцтвы адбываліся па трох турах — выездка, канкур (пераадоленне перашкодаў у замкнёнай прасторы), трохбор'е (манежная язда, палявыя выпрабаванні, канкур).

Спаборніцтвы прайшлі дзякуючы Сусветнай федэрацыі коннага спорту і міністэрству спорту і турызму Рэспублікі Беларусь. Сярод 12 фіналістаў разыгрываўся прыз ад Бі-Сі-Эм — 4000 долараў. Ён быў размеркаваны паміж васьмю пераможцамі.

Вельмі шкада, аднак, што ў Беларусі конны спорт не спансіруецца на належным узроўні.

*Алена КУРХІНЕН*

# ВЫНАХОДНІК ПАДЛОДКІ

Сёлета спаўняецца 210 гадоў з дня нараджэння мінскага шляхціча Казіміра Чарноўскага. Імя яго мала вядомае шырокай публіцы, але жыццёвы подзвіг гэтага чалавека варты ўшанавання.

Казімір нарадзіўся ў маёнтку Карытніца Ігуменскага павета Мінскай губерні. Бацька, Гаўрыіл Станіслававіч, валодаў шасцю вёскамі ў двух паветах — Ігуменскім і Чавускім (больш за 300 дзесяцінаў зямлі і 400 сялянскіх душ).

Выхаванню дзяцей у сям'і надавалі вялікую ўвагу, і бацька часта вазіў малога Казіка за мяжу, каб далучыць да агульнаеўрапейскай культуры. Апрача польскай, ён авалодаў рускай і французскай мовамі, захапляўся паэзіяй А. Міцкевіча і А. Пушкіна, разбіраўся ў пытаннях філасофіі, няблага маляваў і захапляўся архітэктурай. А яшчэ — суткамі праседжваў у саліднай хатняй бібліятэцы, выказваючы асаблівую цікаўнасць да тэхнічных дысцыплінаў і разнастайных тэхнічных навінак.

У 1821 годзе Казімір далучыўся да таемнай шляхецкай арганізацыі "Нацыянальнае патрыятычнае таварыства". У хуткім часе памёр яго бацька, і Казімір без доўгіх разваг адправіў жонку і сына ў Варшаву да цесця, прадаў усе свае вёскі, а на атрыманыя грошы адправіўся ў Пецярбург на "рэвалюцыйную працу". Для канспірацыі ён паступіў у 1824 годзе ў Пецярбургскую медыка-хірургічную акадэмію, але атэстат атрымаць не паспеў — за месяц да заканчэння навучання 6 мая 1829 года да яго на кватэру прыйшлі жандары. Чарноўскага арыштавалі па даносе, які паведамляў пра яго прыналежнасць да таемнага таварыства. Арыштаванага пасадзілі ў адзіночную камеру Кронверкскай курціны Петрапаўлаўскай крэпасці: 2 крокі ў шырыню, 4 — у даўжыню, маленькае акенца з "мядзведжымі" кратамі, адкідны жалезны ложак, у падлогу ўцэментаваны невялічкі столік, на груваcткіх, як сейф, дзвярах — вочка для наглядчыка. Адзінота!

Імя Чарноўскага было забытае на 112 гадоў. Упершыню дакументы пра яго апублікаваў часопіс "Красный архив" у 1941 годзе. Гэта было "Дело по просьбе содержащегося в Санкт-Петербургской крепости минского дворянина Черновского об испытании изобретенного им подводного судна".

У зняволенні Чарноўскі склаў чарцяжы і апісанне вынайдзенай ім падлодкі на 32 аркушах. Паводле яго меркавання, лодка магла ўзрываць варожыя караблі, высаджваць дэсант на тэрыторыі варожых краінаў і нават збіраць жэмчуг на марскім дне. Яго запіска — палымяны гімн падводнаму плаванню і далейшыя велізарныя перспектывы.

Над праектам ён працаваў з 1825 года. Чатыры гады ён вывучаў разнастайную літаратуру па іхтыялогіі і гідрадынаміцы, карабельную архітэктуру і тэорыю караблебудавання. У турме давялося ўзнаўляць праект па памяці.

Станоўчы водгук ад генерал-дырэктара корпуса інжынераў шляхоў зносін П.П. Базена, здавалася, мусіў паспрыяць вырашэнню пытання пра лёс арыштанта і яго вынаходніцтва. Аднак адбылося зусім іншае — пра Чарноўскага забыліся: Ваеннае міністэрства, добра ведаючы, хто з'яўляецца аўтарам вынаходніцтва, вырашыла пахаваць праект. У 1829 годзе Чарноўскага перавялі ў Шлісельбургскую крэпасць, а ў 1834 годзе саслалі на вечнае пасяленне ў Архангельскую губерню. Чалавек адукаваны, там ён змог зрабіць кар'еру — стаў намеснікам архітэктара горада і калежскім асесарам. Можна было падумаць і пра вяртанне ў Пецярбург...

Але ў пачатку 1839 года двое ссыльных палякаў — Гржымкоўскі і Брадоўскі — падгаварылі Чарноўскага на ўцёкі. Яны ж паведамілі ў паліцыю пра яго намер уцячы: можа, спадзяваліся на паслабленне рэжыму, а можа — на вызваленне ад ссылкі. І не марна спадзяваліся: Чарноўскі ўзяўся за арганізацыю не ўцёкаў, а сапраўднага бунту. Ён меркаваў захапіць вайсковы карабель са зброяй і правіянтам і адплыць на ім у Іспанію, дзе тады ішла рэвалюцыйная вайна, а ўжо адтуль вяртацца ў Польшчу і Беларусь. Размах падрыхтоўкі быў велізарным: пасля раскрыцця змовы дапытаць давялося больш за 800 ссыльных "беларусаў і палякаў" і тамтэйшых рыбакоў. Раз'юшаны Мікалай І загадаў выслаць Чарноўскага навечна ў самы аддалены і глухі раён Вяцкай губерні пад строгі нагляд мясцовай паліцыі.

Напрыканцы вясны 1839 года вязень прыбыў у невялікі гарадок Сарапул. Адзінота, турмы і нягоды, няўдачы і пастаянны нагляд паліцыі зрабілі сваю справу — 27 лістапада 1847 года былы вязень самых жахлівых крэпасцяў (Петрапаўлаўскай і Шлісельбургскай) сканаў. У дакументальных матэрыялах архіўнага фонду Вазнясенскага сабора Сарапула ў метрычнай кнізе памерлых за 1847 год пад № 111 значыцца "польскі" шляхціч Казімір Гаўрылавіч Чарноўскі, 56 гадоў, памёр ад прыступу каменнай хваробы. Той сабор быў знесены ў 1933 годзе, і на яго месцы даўно зроблены сквер. Вызначыць месца пахавання Казіміра Чарноўскага, каб пакласці кветкі на яго магілу, немагчыма.

Праект падводнай лодкі Чарноўскага быў знойдзены ў архівах толькі ў 1941 годзе. А вынаходнікам першай пабудаванай падлодкі, якая выкарыстоўвалася ў гады І Сусветнай вайны, таксама быў беларус. Але пра яго — іншым разам.

*В.А. ЯРМОЛЕНКА,*
*прафесар*



# ПАЧУЦЬ МАЛАДЫЯ ГАЛАСЫ

Паводле даных апытання, праведзенага нядаўна Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЭФ), шэсць з дзесяці дзяцей у краінах Еўропы і Сярэдняй Азіі з'яўляюцца сведкамі агрэсіўных паводзінаў і насілля (крыкаў і пабояў) у сваіх сем'ях.

У заяве, апублікаванай у Берліне, прадстаўнікі ЮНІСЭФ адзначаюць, што іх сацыялагічнае даследаванне, названае "Маладыя галасы", грунтуецца на асабістых інтэрв'ю з 15 200 дзецьмі ва ўзросце з 9 да 17 гадоў, якія праводзіліся са снежня 2000 года па люты 2001 года.

На думку прадстаўнікоў ЮНІСЭФ, вынікі апытання даюць карціну поглядаў, асцярогаў, надзеяў і мараў дзяцей і падлеткаў з 26 краінаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, Садружнасці незалежных дзяржаў, дзяржаў Балтыі і краінаў Заходняй Еўропы. У іх таксама падкрэсліваецца, што маладыя людзі бачаць свет, падпарадкаваны гвалту, несправядлівасці і дыскрымінацыі.

У даследаванні ўказваецца, што амаль палова апытаных дзяцей адчувае, што ім не стае базавай інфармацыі пра эпідэмію СНІДу (65 % ва ўзроставай групе ад 9 да 13 гадоў і 27 % ва ўзроставай групе ад 14 да 17 гадоў), у той час як 61 % апытаных лічыць, што іх погляды не бяруцца пад увагу ці не разглядаюцца ўвогуле мясцовымі ўрадамі.

"Дзеці — гэта не толькі наша будучыня, яны — наша цяперашчына, і мы павінны пачаць сур'ёзна прыслухоўвацца да іх галасоў. Мы павінны слухаць уважліва тое, што збіраюцца сказаць маладыя людзі, і павінны прадаставіць ім магчымасць выказацца. Мы павінны зблізіцца з імі і спрыяць таму, каб яны ўдзельнічалі ў працэсе прыняцця рашэнняў, якія закранаюць іх жыцці", — сказала дырэктар-выканаўца ЮНІСЭФ Кэрал Бэламі.

Вынікі сацыялагічнага апытання былі апублікаваныя ў першы дзень працы рэгіянальнай сустрэчы высокага ўзроўню ў Берліне — "Канферэнцыя дзяцей Еўропы і Сярэдняй Азіі", на якой належыць выпрацаваць новы рэгіянальны парадак дня ў інтарэсах дзяцей на наступнае дзесяцігоддзе. Канчатковыя вынікі апытання будуць прадастаўленыя дэлегатам спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у інтарэсах дзяцей у Нью-Йорку ў верасні бягучага года.

*Паводле інфармацыі Прадстаўніцтва ААН у Беларусі*

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана да друку ў 12.00*

*31 мая*
*Зак. 320у*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.*

**Рэдактар Т.М. КАЗАК**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка Юрыя Жукава*